materiały I Międzynarodowej Konferencji Naukowej, Koszalin, 14 grudnia 1995. – Koszalin, 1995. – S. 70–77.

23. Информация о проведении операции по выселению семей осадников и лесной стражи по Ошмянскому району // Беларуская нацыя : уз'яднанне. Верасень 1939 – чэрвень 1941 г. : зб. дакументаў і матэрыялаў / Аўт.-уклад. У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2004. – С. 189–191.

24. Постановление Бюро Белостокского обкома КП(б)Б «Мероприятия по выселению осадников и лесной сторожевой охраны» // Беларуская нацыя : уз'яднанне. Верасень 1939 – чэрвень 1941 г. : зб. дакументаў і матэрыялаў / Аўт.-уклад. У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2004. – С. 192–193

УДК 271.22(476.25)«19»

**І. А. Грышчанка, С. А. Юрыс**
Гомельскі дзяржаўны
тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога, г. Гомель

# АДНАЎЛЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ МІКАЛАЕЎСКАЙ ЦАРКВЫ Ў ГОРАДЗЕ ГОМЕЛІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І АФАРМЛЕННЕ ПРЫХОДУ

*У прадстаўленым артыкуле разглядаецца палітыка акупацыйных улад у адносінах да Рускай Праваслаўнай Царквы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На аснове існуючых архіўных дадзеных апісваецца працэс аднаўлення дзейнасці Мікалаеўскай царквы ў Гомелі, аднаўленне тут прыходу. Прасочаны лёс Мікалаеўскай царквы ў першыя пасляваенныя гады, паказаны ўзаемаадносіны мясцовага духавенства і вернікаў з органамі дзяржаўнай улады.*

Гомель быў захоплены нямецка-фашысцкімі войскамі 19 жніўня 1941 г. Акупацыйныя ўлады ў прапагандысцкіх мэтах дазволілі адкрываць цэрквы, іх лаяльнасць да Праваслаўнай царквы была прадыктавана тактычнымі меркаваннямі: схіліць мясцовае насельніцтва на свой бок і выкарыстаць патэнцыял Царквы ў прапагандзе супраць савецкай улады. У той жа час кіраўніцтва III рэйха падкрэслівала чужароднасць хрысціянскага вучэння нацысцкай ідэалогіі, якая мела ў сваёй аснове неапаганскія карані.

Акупіраваныя заходнія тэрыторыі СССР былі падзелены на рэйхскамісарыяты «Остланд» і «Украіна». Гомель быў уключаны ў зону вайсковага тылу групы армій «Цэнтр». Каб спыніць любую кансалідацыю насельніцтва на акупіраваных тэрыторыях, быў праведзены новы адміністрацыйны падзел, які не супадаў не толькі з межамі савецкіх рэспублік, але і са зноў утворанымі царкоўнымі акругамі. Так, напрыклад, Гродзенская і Беластоцкая епархіі ўвайшлі ў склад Усходняй Прусіі і павінны былі падпарадкоўвацца архіепіскапу Серафіму (Лядзе), які прадстаўляў Замежную рускую царкву. Пінская епархія першапачаткова ўвайшла ў склад аўтакефальнай Украінскай царквы, а Брэсцкая – аўтаномнай Украінскай Царквы. На сакавіцкім Саборы епіскапаў у 1942 г. архіепіскап Гродзенскі і Вілейскі Панцеляймон (Ражноўскі) быў абраны мітрапалітам усяе Беларусі і былі вызначаны шэсць епархій Беларускай мітраполіі: Мінская (на чале мітр. Панцеляймон (Ражноўскі)), Беластоцка-Гродзенская (архіеп. Венядзікт (Бабкоўскі)), Магілёўская (архіеп. Філафей (Нарко)), Віцебская (еп. Апанас (Мартас)), Смаленска-Бранская (еп. Стэфан (Сеўба)), Навагрудска-Баранавіцкая (еп. Веніямін (Навіцкі)). У 1943 г. была ўтворана Гомельская епархія, чаму актыўна садзейнічаў місіянер архімандрыт Серафім (Шахмуць). Гомельскую епархію ўзначаліў епіскап Рыгор (Барышкевіч), які не змог прыехаць у Гомель, паколькі ў 1943 г. да горада наблізілася лінія фронту, а 26 лістапада 1943 г. горад быў вызвалены. Пазней, у маі 1944 г. да Беларускай мітраполіі далучыліся дзве новыя епархіі: Пінская і Брэсцкая.

Руская Праваслаўная Царква на акупаваных тэрыторыях скарысталася прадстаўленай ёй магчымасцю аднавіць сваю дзейнасць у справе служэння Богу і аказання духоўнай падтрымкі народу ва ўмовах вайны. На тэрыторыі БССР кіраўніцтва БПЦ актыўна ўзялося аднаўляць царкоўнае жыццё, выкарыстоўваючы існуючую сітуацыю. Працэс аднаўлення царкоўна-прыходскага жыцця абапіраўся як на царкоўную іерархію, так і на ініцыятыву насельніцтва.

Для аднаўлення царкоўна-прыходскага жыцця ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі архіепіскап Панцеляймон (Ражноўскі) накіраваў насельнікаў Жыровіцкага Успенскага манастыра архімандрыта Серафіма (Шахмуця) і святара Рыгора Кударэнку. У студзені 1942 г. яны выехалі з Мінска ў Віцебск і, выканаўшы там сваю місію, 4 ліпеня 1942 г. прыбылі ў Гомель. Да гэтага часу гарадскія цэрквы ўжо былі адкрыты. Так, жыхары Залінейнага раёна звярнуліся ў Гомельскую гарадскую ўправу (структура адміністрацыйнага апарата акупацыйных улад) з просьбай аб аднаўленні дзейнасці былой Палескай царквы, у будынку якой да вайны быў уладкованы кінаклуб. Пасля атрымання

дазволу і правядзення рамонту Палеская царква 17 снежня 1941 г. была асвечана добрушскім ігуменам Інакенціем (Мельнічэнкам) і протаіерэем Мікалаем Гейхрохам. Напачатку пастаянных богаслужэнняў у ёй не праводзілася за адсутнасці прыходскага святара і толькі 20 красавіка 1942 г. такім быў прызначаны святар Канстанцін Караскевіч з сяла Баршчоўка [1, с. 21].

Канстанцін Лаўрэнцьевіч Караскевіч (1879–1967) ураджэнец с. Пустынка Сенненскага павета. У 1905 г. пасля святарскага пасвячэння ён быў прызначаны да Прылескай царквы Чавускага павета, а 1 верасня 1907 г. перамешчаны да Святлянскай царквы Літоўскай епархіі. У гады Першай сусветнай вайны святар Канстанцін Караскевіч перамясціўся ў Гомель і часова, будучы па-за штатам, служыў у Мікалаеўскай царкве да 1922 г. Далей ён быў вызначаны настаяцелем да Баршчэўскай Мікалаеўскай царквы цяперашняга Рэчыцкага раёна. У 1931 г. Канстанцін Караскевіч быў арыштаваны «за антысавецкую агітацыю» асуджаны калегіяй АДПУ да пяці гадоў зняволення ў ВПЛ. Пасля вызвалення ён жыў у Гомелі, а восенню 1941 г. прыняў удзел у адкрыцці Баршчэўскай царквы, у якой служыў да пераезду ў Гомель. Настаяцелем гомельскай Мікалаеўскай царквы святар быў да 1943 г. і з набліжэннем савецкіх войскаў пераехаў у Заходнюю Беларусь. Вядома, што Канстанцін Караскевіч памёр у 1967 г. у г. Ашмяны Гродзенскай вобласці [2, с. 315].

Пасля вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (26 лістапада 1943 г.) дзейнасць Палескай царквы не спынілася. З 1 мая 1944 г. яе настаяцелем стаў Міхаіл Пракопавіч Кротт, які прыехаў у Гомель з Сібіры [3, л. 5, 5ад.]. Ён нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў 1885 г. у с. Замосце Рэчыцкага павета Мінскай губерні (цяпер Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці). У 1905 г. Міхаіл скончыў настаўніцкую семінарыю і працаваў настаўнікам у царкоўна-прыходскіх школах Пінскага павета. У 1913 г. ён быў прызначаны псаломшчыкам да Ліпаўскай царквы Рэчыцкага павета. Здаўшы іспыты за курс духоўнай семінарыі, у 1918 г. Міхаіл Кротт быў пасвечаны ў сан святара, пачаўшы сваё служэнне ў Ракшынскай і Касарыцкай цэрквах Бабруйскага павета. У пачатку 1930-х гадоў у сане протаіерэя ён быў перамешчаны ў Хойнікі. Ёсць інфармацыя пра яго арышт у маі 1933 г. і ўтрыманне ў Мазырскай турме. Тады яго прыгаварылі да пяці гадоў. Аднак у анкетах протаіерэй Міхаіл гэты факт не пацвярджаў, указваючы, што без перапынку знаходзіўся ў Хойніках да 1940 г., калі народны суд прыгаварыў яго да трох гадоў за нявыплату падатку. Пакаранне святар адбываў у Барнавуле, у Беларусь ён вярнуўся ў пачатку 1944 г.

Факт знаходжання М. П. Кротта ў Хойніках пасля 1933 г. выклікае сумненне, таму што па кліравых ведамасцях тут служыў іншы святар, а ў 1936 г. царква была зачынена. У некаторых матэрыялах арыштаваных, якія ўтрымоўваліся ў Мазырскай турме, ёсць прамыя ўказанні на тое, што протаіерэй Міхаіл Кротт супрацоўнічаў са следчымі органамі і выконваў ролю «падсаднога агента», таму надалей яму даводзілася хаваць факт свайго арышту ў 1933 г. Тым не менш, яго сапраўды прыгаварылі да трох гадоў у 1940 г., да гэтага часу ён у Хойніках, верагодна, нелегальна выконваў трэбы [2, с. 330].

Мікалаеўская царква панесла значныя страты падчас вайны. Абставіны разбурэння царкоўнага будынка да цяперашняга часу ўстанавіць не ўдалося. Згодна з актам Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі сума панесеных страт склала 414 тыс. 736 руб. Такім чынам, акрамя выканання святарскіх абавязкаў, протаіерэю Міхаілу Кротту неабходна было арганізаваць рамонт будынка царквы і набыць царкоўныя рэчы [4, л. 182].

У 1945 г. Мікалаеўская царква прайшла рэгістрацыю ў Савеце па справах РПЦ пры Савеце Міністраў СССР па Гомельскай вобласці [3, л. 1], [5, л. 90]. Адроджаныя ў гады акупацыі царкоўныя абшчыны пасля вызвалення савецкай тэрыторыі павінны былі заключаць дагаворы з выканаўчымі органамі ўлады аб перадачы ў карыстанне прыходу царкоўнага будынка і культавай маёмасці. Абшчына вернікаў Мікалаеўскай царквы заключыла такую дамову з выканкамам Чыгуначнага Савета дэпутатаў працоўных Гомеля. 26 чэрвеня 1946 г. абшчына прыняла ў бестэрміновае і бясплатнае карыстанне царкву, вартоўню і прадметы культу. Абшчына абавязалася ўтрымоўваць царкву, вартоўню, зямельны участак, маёмасць у належным стане і аплачваць усе выдаткі: рамонт, ацяпленне, асвятленне, падаткі, страхаванне, ахову і інш. У дагаворы падкрэслівалася, што прадстаўляць памяшканне царквы і прадметы культу абшчына магла выключна для задавальнення рэлігійных запатрабаванняў. У інвентарны вопіс павінны былі ўносіцца ўсе новыя набыткі. Прадстаўнікі раённага Савета дэпутатаў працоўных, а таксама ўпаўнаважаны па справах РПЦ беспярэшкодна дапускаліся да перыядычных праверак культавай маёмасці. У выпадку парушэння ўмоў дагавора парушальнікі неслі судовую адказнасць [3, л. 1, 1ад.].

Дзяржаўна-царкоўныя адносіны ў гады вайны крыху палепшыліся, дзякуючы патрыятычнай пазіцыі, якую заняла РПЦ. Сведчаннем істотных змен стала сустрэча старшыні СНК СССР, сакратара ЦК УКП(б) І. В. Сталіна і Патрыяршага месцаахоўніка мітрапаліта Сергія (Страгародскага), якая адбылася 4 верасня 1943 г. у Крамлі.

У ходзе перагавораў быў дадзены дазвол на правядзенне Архіерэйскага Сабора для выбрання Патрыярха, якім 8 верасня 1943 г. стаў месцаахоўнік патрыяршага прастола мітрапаліт Сергій. Улады запэўнілі членаў Свяшчэннага Сінода РПЦ, што не будуць перашкаджаць адкрыццю новых храмаў. Усё гэта дазволіла захаваць за вернікамі адчыненыя ў гады акупацыі храмы.

Дасягнутыя падчас сустрэчы дамоўленасці былі канкрэтызаваны ў шэрагу пастаноў урада СССР. 14 верасня 1943 г. прынята пастанова СНК СССР аб утварэнні Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры СНК СССР. У лістападзе 1943 г. выйшла пастанова аб парадку адкрыцця цэркваў. У маі 1944 г. быў утвораны Савет па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР [6, с. 222, 230].

22 жніўня 1945 г. пастановай СНК СССР Патрыярхіі, епархіяльным упраўленням, прыходскім абшчынам было дадзена абмежаванае права юрыдычнай асобы, што давала магчымасць адкрываць фінансавыя рахункі, заключаць здзелкі, купляць будынкі, ствараць прадпрыемствы, наймаць работнікаў.

Аднак некаторыя паслабленні, дадзеныя РПЦ, не азначалі, што савецкая дзяржава лаяльна стала ставіцца да рэлігіі. Сведчаннем гэтага з'яўляецца пастанова ЦК УКП(б) «Аб арганізацыі навукова-асветніцкай прапаганды» ад 27 верасня 1944 г. Адпаведную пастанову 17 кастрычніка гэтага года прыняў і ЦК КП(б)Б. Яна абавязвала партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі, органы народнай адукацыі і культурна-асветніцкія ўстановы «шырока паставіць» антырэлігійную прапаганду, падкрэсліўшы, што яна «набывае ў цяперашніх умовах асабліва важнае значэнне ў справе далейшага ўздыму культурнага ўзроўня шырокіх пластоў працоўных і пераадолення перажыткаў бескультур'я, забабонаў» [7, с. 471–472].

У канцы чэрвеня 1946 г. на месца святара Мікалаеўскай царквы быў прызначаны протаіерэй Ян Канстанцінавіч Громаў з Бабруйска. На момант прызначэння ён быў удаўцом і пражываў па адрасе Палеская, 53 [4, л. 183]. Пры яго настаяцельстве ў 1947 г. будынак Мікалаеўскай царквы быў капітальна адрамантаваны, дах адноўлены і пакрыты новым жалезам. Храм умяшчаў 900 чалавек, меў тры малыя званы. Побач з царквой быў пабудаваны новы прычтавы дом [8].

Па дадзеных дакументаў у канцы 1940-х гадоў наведвальнасць Мікалаеўскай царквы была даволі высокай – за абедняй у храме збіралася да 100 чалавек. Абшчына праводзіла значную работу сярод вернікаў і магла платна ўтрымліваць рэгента і хор. У царкоўны савет і рэвізійную камісію ў 1948 г. уваходзілі: настаяцель храма Громаў Ян

Канстанцінавіч, 1894 г. н., які з'яўляўся старшынёй царкоўнага савета; Куган Аляксандр Ігнатавіч, 1886 г. н., царкоўны стараста; Шырын Аляксандр Іванавіч, 1876 г. н., памочнік старасты, інжынер; Страдомская Ганна Паўлоўна, 1890 г. н., прасфорня, хатняя гаспадыня. Рэвізійная камісія ўключала трох чалавек: старшыня камісіі Касцюк Стэфан Іванавіч, 1876 г. н., пенсіянер; Румысаў Ціхан Прохаравіч, 1878 г. н., пенсіянер; Шымановіч Іван Іванавіч, 1888 г. н., пенсіянер [9, л. 17].

Такім чынам, можна адзначыць, што для перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя характэрна няроўнасць у дзяржаўна-царкоўных адносінах. У выніку патрыятычнай дзейнасці духавенства і вернікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны і іх унёску ў павышэнне абароназдольнасці краіны адбыліся змены поглядаў часткі кіраўнікоў краіны на ролю царквы ў савецкай дзяржаве. Кіраўніцтва дапускала выкарыстанне духоўнага патэнцыялу царквы для вырашэння надзённых задач. Аднак лаяльнае стаўленне дзяржаўных органаў да царквы працягвалася нядоўга. Ужо з 1948 г. адзначаюцца выпадкі абмежаванняў у дзейнасці духавенства і стварэння перашкод пры рэгістрацыі новых абшчын і адкрыцці новых цэркваў.

Усе гэтыя павароты дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да РПЦ адбіліся і на становішчы Мікалаеўскай царквы. У Мікалаеўскай царкве аднавілася богаслужэнне. У першыя пасляваенныя гады будынак храма ўдалося адрамантаваць, распісаць, устанавіць іканастас, набыць царкоўныя рэчы. Росту наведвальнасці храма садзейнічалі не толькі нягоды ваеннага ліхалецця, але і дзейнасць яе кліру, які змог наладзіць прыходскае жыццё.

## Крыніцы і літаратура

1. Кривонос, Ф. П. Незабвенный пастырь преподобномученик Серафим Жировицкий / протоиерей Феодор Кривонос. – Мн : ВРАТА, 2016. – 52 с.

2. Гомель церковный, XVI–XX вв. : исторические очерки / авт. текста, сост.: С. В. Цыкунов, И. В. Ольшанов. – Гомель : Редакция газеты «Гомельская праўда», 2022. – 402 с.

3. Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Ф. 1354. – Оп. 5. – Д. 5. Документы о регистрации религиозного общества русской православной церкви в г. Гомеле Гомельской области БССР. 1945–1991 гг.

4. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 951. – Оп. 1. – Д. 7. Уполномоченному по делам РПЦ при министерстве БССР протоиерея Михаила Кротта, г. Гомель, ул., Воровского 66. Заявление. 1946 г.

5. НАРБ. – Ф. 951. – Оп. 1. – Д. 5. Справка о церкви благочинного Гомельского округа Пиневича на 15 марта 1946 г.

6. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]; навук.рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.

7. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК : в 6 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск : Беларусь, 1983–1987. – Т. 3 : 1933–1945. – 1985. – 550 с.

8. Алейникова, М. ...И в кружку денежки бросали. – [Электронный ресурс]. Режим доступа : https://gp.by/novosti/obshchestvo/news24043.html – Дата доступа: 19.09.2019.

9. ГАГО. – Ф. 3441. – Оп. 1. – Д. 1. Отчеты и доклады о работе уполномоченного Совета по делам РПЦ по Гомельской области за 1947 г.

УДК 94(476)«1930-е»:352.075.1

**С. А. Елизаров**
Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого, г. Гомель

# ФОРМИРОВАНИЕ ОРГАНОВ СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ зИ УПРАВЛЕНИЯ ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ (1939–1941 ГОДЫ)

*В статье рассмотрены вопросы образования Гомельской области и формирования местных органов государственной власти и управления. Между республиканским центром и районами воссоздавалось промежуточное звено в виде областных органов, наделенных управленческо-контролирующими функциями. В экономической сфере они главным образом занимались перераспределением государственных доходов между нижестоящими Советами. Выборы в областной Совет 1939–1940 гг. завершали процесс легитимизации советской системы органов власти и управления на Гомельщине соответственно Конституции БССР 1937 г. и новым нормам избирательного права.*

Переход на рубеже 1920-х – 1930-х гг. к форсированному строительству социализма в СССР предопределил смену приоритетов в государственном строительстве – переход от политики реального расширения функций местных органов власти и управления, насыщения их соответствующими материальными и финансовыми ресурсами, к построению централизованной системы с жесткой вертикальной соподчиненностью управленческих звеньев.